# КАНЦЭПТ “КАХАННЕ” Ў МОВЕ ПАЭЗІІ ГЕНАДЗЯ БУРАЎКІНА

*А.С. Дзядова*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Адным з надзённых пытанняў сучаснага мовазнаўства з’яўляецца вызначэнне спецыфікі мастацкай канцэптасферы як фрагмента нацыянальных канцэптасфер. Мастацкі тэкст выступае каштоўным матэрыялам для даследавання асаблівасцей светаўспрыняцця, мыслення і псіхікі пэўнага этнасу, а ў цэлым яго нацыянальнай карціны свету. У святле сказанага тэма нашага даследавання з’яўляецца *актуальнай.*

*Мэта* артыкула – выявіць і прааналізаваць лексічныя сродкі рэпрэзентацыі канцэпту “каханне” ў мове паэзіі Г. Бураўкіна.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з’яўляюцца зборнікі паэзіі Г. Бураўкіна “Выбранае” [1] і “Пяшчота” [2]. Асноўнымі метадамі выступаюць апісальны метад і метад канцэптуальнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У розныя перыяды развіцця грамадства каханне, як з’ява духоўнага і сацыяльнага жыцця людзей, інтэрпрэтавалася па-свойму. Сучасная псіхалогія дае азначэнне каханню як інтымнаму пачуццю, якое накіравана на іншага чалавека. Каханне ўяўляе сабой павышаны пачуццёва-эмацыйны стан чалавечай псіхікі, накіраваны на прадмет сваёй сімпатыі – асобу процілеглага полу.

У мове паэзіі Г. Бураўкіна ядром эмацыйнага канцэпту “каханне” як спецыфічнага лінгваментальнага ўтварэння і дастаткова буйной сэнсавай парадыгмы мовы выступае лексічная адзінка *каханне*, праз якую выражаюцца эмоцыі і пачуцці аўтара. Майстар слова праўдзіва і пранікнёна распавядае пра таямніцы кахання, горыч расстання і радасць сустрэч, клапатлівае стаўленне лірычнага героя да жыцця сваёй абранніцы. Паэт захапляецца прыгажосцю жанчыны, стаіць на каленях перад цудам жаночай прывабнасці, выказвае падзяку за *“таямніцу вачэй”*, за *“святыя імгненні жывой радасці”* і *“душу адзінства”*.

На думку Г. Бураўкіна, паўнавартаснае жыццё немагчымае без адчування кахання, якое акрыляе і натхняе, мяняе твае прыярытэты на карысць таго, без каго не ўяўляеш свайго існавання: *Ты ўсё роўна без каханай – / Палавіна чалавека* [2]. У інфармацыйным змесце дадзенага канцэпту найперш вылучаецца паняццевы кампанент ‘немагчымасць жыць без каханага чалавека’. Як бачна з прыведзенага прыкладу, глыбіня гэтага эмацыйнага пачуцця раскрываецца праз гіпербалу *палавіна чалавека.* Несумненна, аўтар перабольшвае немагчымасць фізічнага і духоўнага існавання чалавека без каханага ці каханай, падкрэсліваючы разбурэнне, нікчэмнасць, свайго роду незавершанасць унутранай сутнасці чалавека без шчырых пачуццяў да каханага. У якасці “калекі” *(палавіны чалавека)* выступае той, хто не мае “роднага, блізкага сэрца” побач.

У якасці лексічных рэпрэзентантаў канцэпту “кахання”, што сустракаюцца ў мове бураўкінскіх паэтычных твораў, дастаткова часта выступаюць словы *радасць* і *шчасце,* якія ўваходзяць у змест інтэрпрэтацыйнага поля дадзенага кагнітыўнага ўтварэння. І гэта невыпадкова, бо закаханыя, як правіла, адчуваюць сябе надзвычай шчаслівымі і задаволенымі. Яны знайшлі адно аднаго і цяпер пойдуць па жыцці разам: *Каханне – гэта шчасце, / Якога хопіць на ўсё жыццё* [2]. Як бачым, разуменне шчасця выражае аўтарскае ўяўленне пра тое, што на жыццёвым шляху чалавека “прысутнасць” кахання абавязковая, бо гэтае эмацыйнае пачуццё проста неабходнае для таго, каб атрымліваць задавальненне ад жыцця. Іншымі словамі, каханне – гэта шчасце, якое дорыць табе абраннік ці абранніца. Каханне злучае жыцці людзей, яно нібы агульны, сумесны набытак, падарунак лёсу. Заслугоўвае асобнай увагі полевы складнік канцэпту ‘ўзаемнасць кахання як эмацыйнага пачуцця’: *Што нам дзяліць найлепшае з дзівос, / Якое нават смерць забраць не ў стане? – Зямное непаўторнае каханне – Адно на двух нам даў шчаслівы лёс* [1]. Як бачым, сапраўднае каханне – гэта дзівоснае, выключнае і асаблівае пачуццё, якое ў чалавека не можа адабраць нават смерць.

Праз вершы адчуваецца, што паэту пашчасціла самому адчуць гэтае шчымлівае пачуццё: *Ціхае шчасце – / Шэпат каханкі* [2]. Нездарма кажуць, што шчасце любіць цішыню. Для стварэння больш кранальнай і запамінальнай карціны любоўных пачуццяў Г. Бураўкін невыпадкова выкарыстоўвае эпітэт *ціхае шчасце*, які падкрэслівае шчырасць інтымных



Репозиторий ВГУ

перажыванняў, адсутнасць у закаханых жадання паведаміць іншым пра свае блізкія адносіны, каб не адпужаць ад сябе тое, што знайшлі і перажылі разам. Герою верша для таго, каб адчуваць сябе шчаслівым, дастаткова чуць шэпт сваёй каханай – шэпт, які, з'яўляючыся часткай любоўнай гульні, нясе абаім станоўчыя эмоцыі. Праз эпітэт *горкі шэпт*, які выступае ў якасці перцэптыўнага складніка вобраза канцэпту "каханне", аўтар паказвае "маштаб" успрыняцця разрыву любоўных адносін паміж закаханымі на ўзроўні розуму: *Сябе да адзіноты прывучаю, / А шэпт твой горкі ўсё па сэрцы б'е* [2]. Герой прывучае сябе да адзіноты, якая ўспрымаецца ім як адсутнасць побач каханай жанчыны.

У канцэптуалізацыі паняцця "каханне" нярэдка ўдзельнічае назоўнік *сэрца*, які, як вядома, у моўнай карціне беларусаў і рускіх успрымаецца ў якасці эмацыйнага "цэнтра" перажыванняў чалавека: *І нясу, каханнем асвечаны, / Па вясновай зямлі сэрца гром-біццё* [2]. Метафарычнае прыпадабненне ўдараў сэрца да ўдараў грому спрыяе больш глыбокаму ўспрыняццю і асэнсаванню шчырых любоўных перажыванняў героя, яго акрыленых пачуццяў, якія сугучныя вясноваму абуджэнню прыроды.

Заўважым, што каханне для Г. Бураўкіна – гэта яшчэ і гатоўнасць ахвяраваць усім дзеля любімай жанчыны. Ідэя ахвярнасці і адданасці каханаму чалавеку раскрываецца ў паэтычным творы "Такі спрадвечны лёс мужчын": *Такі спрадвечны лёс мужчын:/... выпіць дзесяць рэк, /І любай палажыць да ног / Увесь свой скарб і грэх* [1]. Каханне – гэта крыніца радасці і найлепшых памкненняў мужчыны дзеля сваёй адзінай, абагаўленне яе, адчуванне павагі да жанчыны, захапленне яе знешняй і ўнутранай прыгажосцю, прывабнасцю, душэўнымі якасцямі. Метафарычны выраз *палажыць да ног... скарб і грэх* яскрава раскрывае глыбіню, сапраўднасць і непадробнасць гэтага чыстага і светлага пачуцця з боку мужчыны.

Трэба адзначыць, што Г. Бураўкін па-майстэрску выкарыстоўвае разгорнутыя метафарычныя выразы, якія дапамагаюць раскрыць змест дадзенага канцэпту. У тым выпадку, калі каханне прайшло, засталося ў мінулым, а пачуцці закаханых, якія сталі абыякавымі адно да аднаго, астылі, паэт раіць наступнае: *Кахання высахлыя крошкі / У сховах памяці збяры* [1]. Метафарычнае параўнанне былых пачуццяў з сухім драбком пацвярджае наступную думку: нельга аднавіць тое, што страчана, чаго ўжо няма ў сэрцы, як нельга цяпер напоўніцу адчуць тыя шчырыя эмоцыі, якія былі раней. Але ж засталіся ўспаміны аб каханні, пра што сведчыць метафара *ў сховах памяці.*

Філасофскія разважанні пра лёс чалавека, месца кахання на яго жыццёвым шляху гучаць у наступным паэтычным кантэксце: *Мы ўсе праходзім поўны круг жыцця – / Ад першых слёз / Да сціхлага дыхання, / Адпіўшы чашу хмельнага кахання, / Адчуўшы колкі холад забыцця* [1]. Сапраўды, часта бывае і так, што закаханыя, адчуўшы ўсю сілу гэтага непаўторнага пачуцця, *"адпіўшы чашу хмельнага кахання"*, з часам разыходзяцца ў розныя бакі і ідуць па сваёй жыццёвай дарозе ўжо паасобку. Аналіз асобных моўных кантэкстаў сведчыць пра тое, што страта чалавекам кахання асацыюецца ў паэта са свечкай як сімвалам таго, што згублена або па нейкіх прычынах засталося ў мінулым: *Таму ці варта плакаць над сабою, / Над свечкаю былога пачуцця...?* [2]. Канцэптуалізацыя кахання адбываецца тут праз назоўнік *свечка* і дзеяслоў *плакаць*, якія семантызуюць адмоўныя эмацыйныя пачуцці і перажыванні. У рытарычным пытанні на фоне свечкі паказваецца перыяд жыцця, калі ты кахаў, але, відаць, склалася так, што цяпер той час нават не варты ўспаміну. Маўклівы смутак, шкадаванне аб незваротным каханні, стрыманасць пачуццяў рэпрэзентаваны таксама праз іншыя метафарычныя назоўнікі і словазлучэнні накшталт наступных: *зіма, маўчанне, холад расстання*. Напрыклад: *Глухое маўчанне. / Падкрэслены холад расстання* [2].

**Заключэнне.** Такім чынам, у паэзіі Г. Бураўкіна канцэпт "каханне" рэпрэзентуецца праз шматлікія моўныя кантэксты. Дзякуючы разнастайным лексічным вербалізатарам, якія, выступаюць у якасці складнікаў вобразнага і інфармацыйнага зместу канцэпту, семантызуецца шматграннасць і супярэчлівасць гэтага эмацыйнага пачуцця, яго вялікае значэнне ў жыцці чалавека, асэнсаванні ім свайго ўнутранага "я".


1. Бураўкін, Г.М. Выбранае / Г.М. Бураўкін. Вершы. Паэмы. Казкі. Песні. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1998. – 382 с.
2. Бураўкін, Г.М. Пяшчота / Г.М. Бураўкін. Вершы пра каханне. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – 94 с.


Рэпазіторый ВДУ